2022 год

ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

# Звесткі з архіва Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з'яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2022 год з'яўляецца юбілейным.*

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ








## 85 гадоў

**Лынькоў, М. Міколка-паравоз / М. Лынькоў. – Мінск : ДВБ Дзіцячая літаратура, 1937. – 118 с., [2] с.**

*Аповесць для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. У мінскую друкарню імя Сталіна (Дом друку) была здадзена 17.05.1937 г., а падпісана да друку 28.10.1937 г. У выданні змяшчаліся чорна-белыя і каляровыя ілюстрацыі. Кніга мела цвёрдую вокладку. Тыраж – 10 000 экзэмпляраў.*

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Падзеі аповесці «Міколка-паравоз» пачынаюцца напярэдадні рэвалюцыі 1917 года. Герою, Міколку, 11 гадоў. Міколкава сям’я жыве ў старым вагоне-цяплушцы, бацька працуе машыністам паравоза. Ёсць яшчэ маці Ганна ды смешны дзед Астап. Бацька Міколкі дапамагае падпольшчыкам, трапляе ў турму. Міколка вырашае паскардзіцца цару на начальніка станцыі, які творыць несправядлівасці. Аднак хлопчыка збіваюць жандары прама пад партрэтам цара... Потым грамадзянская вайна, і Міколка разам з дарослымі ўдзельнічае ў барацьбе супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў.*

*Міхась Лынькоў стварыў цудоўны вобраз цікаўнага і вясёлага, знаходлівага і спрытнага, смелага і абаяльнага хлопчыка. Займальны сюжэт, тонкі гумар і мяккі лірызм абумовілі поспех твора і дазволілі вытрымаць выпрабаванне часам.*

*Па словах галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура» В.А. Шніпа, Міколка-паравоз – гэта своеасаблівы брэнд, які ведаюць большасць беларусаў. І сапраўды, з 1937 па 2021 год аповесць неаднойчы перавыдавалася. У савецкі час тыражы складалі ад 7 да 160 тысяч экзэмпляраў. На сённяшні дзень агульная колькасць асобнікаў, выдадзеных за ўвесь час толькі ў Беларусі, – амаль 600 тысяч! З улікам шматлікіх выданняў «Міколкі-паравоза», што ажыццяўляліся яшчэ і замежнымі выдавецтвамі, гэтая лічба можа быць знана большай.*

# *2022 год*
# *ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ*

*У 1956 годзе па матывах аповесці «Міколка-паравоз» на кінастудыі Беларусьфільм быў зняты аднайменны мастацкі фільм. Рэжысёр-пастаноўшчык – Леў Голуб.*










# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Цікава, што выдуманы аўтарам аповесці горад Забельск здымалі ў Гродне, і ў згаданым вышэй фільме «Міколка-паравоз» можна ўбачыць, якім быў будынак чыгуначнага вакзала горада да таго, як яго знеслі ў 1986 годзе.*





# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

## 85 гадоў

**Лынькоў, М. Пра смелага ваяку Мішку яго слаўных таварышоў / М. Лынькоў. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1937. – 71 с.**




*Аповесць для дзяцей малодшага ўзросту, складаецца з адзінаццаці сэнсава закончаных апавяданняў.*

*У мінскую друкарню імя Сталіна (Дом друку) была здадзена 01.06.1937 г., а падпісана да друку 25.08.1937 г. Кніга мела мяккую вокладку, змяшчала чорна-белыя ілюстрацыі. Тыраж – 15 000 экзэмпляраў.*

*Кніга шмат разоў перавыдавалася як у савецкі час, так пасля.*

# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Казка-аповесць «Пра смелага ваяку Мішку яго слаўных таварышоў» – гэта твор пра дружбу мядзведзя Мішкі, казла Барадатага і сабакі Жука, якія ў дні грамадзянскай вайны разам з чырвонаармейцамі ўдзельнічаюць у баявых паходах, падбадзёрваюць байцоў дасціпнымі выхадкамі, здзяйсняюць фантастычныя подзвігі.*




